Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 2. Варыянт 3

Білет №2. Практычнае заданне. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь

Заданні склала: Нікіценка Наталля Іванаўна, настаўнік гісторыі і грамадазнаўства ДУА "Сярэдняя школа №13 г.Жлобіна імя В.В.Гузава"

Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні:
Пытанні і заданні 1. Якую прадукцыю вырабляе беларуская эканоміка?
2. Якія галіны эканомікі рэспублікі з'яўляюцца вядучымі ў нашай краіне?
3. У Рэспубліцы Беларусь створана сацыяльна арыентаваная рынкавая эканоміка. Што робіцца ў Рэспубліцы Беларусь для развіцця сацыяльнага напрамку?
4. Дайце ацэнку сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь.

Крыніца I

Выступленне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі на VI Усебеларускім народным сходзе (люты 2022 года.)

Краіна стабільна займае высокія месцы ў рэйтынгу чалавечага развіцця. Айчынная ахова здароўя дэманструе эфектыўную працу нават ва ўмовах пандэміі. Традыцыйныя галіны - машынабудаванне, хімічная прамысловасць, сельская гаспадарка - працуюць бесперабойна. Фармуюцца касмічная, атамная, біяхімічная галіны эканомікі. Значна ўмацаваны лагістычны патэнцыял, населеныя пункты звязаны сучаснымі транспартнымі магістралямі, рэалізавана ў поўным аб'ёме праграма жыллёвага будаўніцтва. Бясспрэчным брэндам краіны стаў дасягнуты намі найвышэйшы ўзровень камфорту і бяспекі.

Крыніца II

Структура расходаў бюджэту Рэспублікі Беларусь на 2021 год, %

Кірунак выдаткаў бюджэту	Працэнт у бюджэце
Агульнадзяржаўная дзейнасць	26,9
Нацыянальная эканоміка	12,8
Нацыянальная абарона	3,4
Адукацыя	17,3
Ахова здароўя	16,3
Сацыяльная палітыка	8,0

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

Крыніца ІІІ

Месца Беларусі ў сусветным экспарце 2018 г.

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

Адказы:
1. Беларуская сельская гаспадарка вырабляе і прадае за мяжу прадукцыю малочнай жывёлагадоўлі: малако канцэнтраванае, масла сметанковае, сыры і тварог.

2. Вядучымі галінамі эканомікі Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца машынабудаванне, хімічная і харчовая прамысловасць, сельская гаспадарка.

3. Беларусь прытрымлівае мадэлі сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі. Гэта значыць, што якія б важныя задачы не вырашаліся, прыярытэтам з'яўляецца справядлівае і годнае вырашэнне праблем канкрэтных людзей і грамадства ў цэлым. Створана сістэма з 40 сацыяльных стандартаў, якія вызначаюць віды і якасць найважнейшых сацыяльных паслуг, выплачваюцца пенсіі. Напрамкі сацыяльнай абароны насельніцтва: даступная для шырокіх слаёў насельніцтва ахова здароўя, даступная адукацыя. Сацыяльная абарона грамадзян, якія маюць патрэбу ў асаблівай падтрымцы дзяржавы. Высокімі тэмпамі вядзецца жыллёвае будаўніцтва, ажыццяўляецца падтрымка грамадзян у забеспячэнні жыллём. Бясспрэчнай перавагай з'яўляецца найвысокі ўзровень камфорту і бяспекі.

4. Беларусь з'яўляецца касмічнай дзяржавай, запусціўшы касмічны спадарожнік. Па расійскіх тэхналогіях пабудавана Беларуская АЭС, у нашай краіне развіваецца вытворчасць медыцынскіх прэпаратаў, развіцця біялагічных, медыцынскіх, фармацэўтычных і хімічных тэхналогій. Развіццё сучасных і навукаёмістых вытворчасцей дазваляе вытрымліваць канкурэнцыю на сусветным рынку, дае магчымасць развіваць сучасныя тэхналогіі і дае перспектыву для Рэспублікі Беларусь увайсці ў склад развітых эканомік свету.